

# «АВАНС, ЯКІ ДЗЯРЖАВА ВЫДЗЕЛІЛА БЕЛАРУСКАМУ КІНЕМАТОГРАФУ, ТАК І НЕ АДПРАЦАВАНЫ»

**Прэтэнзіі і патрабаванні да «найважнейшага з мастацтваў» Прэзідэнт выказаў жорстка і катэгарычна**

(Працяг на стар. 2–4)


РОДНАЯ ГАЗЕТА НА РОДНАЙ МОВЕ

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

11 ЧЭРВЕНЯ СЕРАДА № 111 (30499)


# ЯКАСЦЬ — ЭЛЕМЕНТ ФІЛАСОФІІ І ВЫТВОРЧАСЦІ

**У чым сакрэт поспеху ЗАТ «Атлант»?**

Беларускія халадзільнікі «Атлант» ведаюць спажыўцы ў больш чым 30 краінах свету. І, як прызнаюцца на прадпрыемстве, галоўная ўзнагарода — тое, што пакупнікі рублём галасуюць за іх бытавую тэхніку. Сакрэт жа поспеху на рынку — у нязменна высокай якасці прадукцыі. Прадпрыемства — неаднаразовы лаўрэат Прэміі Урада Рэспублікі Беларусь у галіне якасці. Клопат пра яе пачынаецца нават не на этапе ўваходнага кантролю сыравіны, а нашмат раней — за год-два да таго, як выраб паступіць у серыйную вытворчасць, яшчэ падчас стварэння новага вырабу. Праводзіцца і комплексная цэнавая палітыка, каб бытавая тэхніка не атрымалася занадта дарагой. Як ЗАТ «Атлант» ужо на працягу больш як шасці дзесяцігоддзяў атрымліваецца вырабляць якасны прадукт, паглядзелі карэспандэнты «Звязды». СТАР. 8–9













ЯК У МІНСКУ ВЫРАШАЮЦЬ ПРАБЛЕМУ ДАЎГАБУДАЎ 12


Яшчэ больш цікавых навін па-беларуску — у нашым тэлеграм-канале @zviazdaby. Падпісвайцеся, чытайце, будзьце ў курсе!


ПРАБЛЕМА І РАШЭННІ

## АБАНЕНТ МАЛАДАСТУПНЫ... АЛЕ ГЭТА ЧАСОВА

**Для таго каб мабільная сувязь была якаснай у кожным населеным пункце, робіцца шмат. Проста жыхарам некаторых з іх трэба крыху пачакаць**

Праблема даступнасці і якасці мабільнай сувязі ў кожным кутку краіны знаходзіцца на кантролі на самым высокім узроўні. У жніўні мінулага года Прэзідэнт Беларусі падпісаў адпаведны ўказ, згодна з якім сотавыя аператары ў абавязковым парадку павінны будуць накіроўваць частку прыбытку на будаўніцтва новых вышак, мадэрнізацыю дзеючых аб'ектаў і іншыя меры па развіцці сетак сотавай сувязі, што дасць магчымасць павялічыць зону пакрыцця і ўстойлівасць сігналу. СТАР. 6–7



Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2025 года

Мы абяцаем нясумны час з любімай газетай.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!


ISSN 1990 — 763X

# «АВАНС, ЯКІ ДЗЯРЖАВА ВЫДЗЕЛІЛА ТАК І НЕ

## Прэтэнзіі і патрабаванні да «найважнейшага з мастацтваў»

Цытату аб тым, што кіно — найважнейшае з усіх мастацтваў, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ўзгадваў неаднойчы, адзначаючы, што цалкам падзяляе меркаванне аўтара гэтых слоў. Кіраўнік дзяржавы заўсёды цікавіцца станам айчыннага кінематографа, яго праблемамі і перспектывамі. У аўторак Прэзідэнт прысвяціў гэтай тэме шырокую нараду. Разглядалі надзённыя, а недзе і балючыя пытанні ў сэрцы айчыннага кінематографа — на кінастудыі «Беларусьфільм».



Фота БелТА.

### «ГРОШАЙ НЕ ШКАДА, КАЛІ ЁСЦЬ ВЫНІК»

Пачаў кіраўнік дзяржавы з самай сутнасці. «Што, дрэнна зусім тут?» — адразу па прыездзе спытаў ён у намесніка прэм'ер-міністра Наталлі Пяткевіч. Яна адказала, што трэба дапамагаць. «Што значыць «дапамагаць»? У чарговы раз?» — удакладніў кіраўнік дзяржавы. Наталля Пяткевіч адзначыла, што да кіраўніцтва гэтай сферай прыйшлі новыя людзі і ў іх ёсць жаданне змяніць сітуацыю ў лепшы бок. Але ў некаторых пытаннях, напрыклад, у гаспадарчых, ім трэба дапамагчы. Маецца на ўвазе знос некаторых будынкаў, зніжэнне выдаткаў. «Гэта значыць, калі знясём, то справы пойдуць?» — іранічна спытаў Аляксандр Лукашэнка. Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый Крутой, які падключыўся да размовы, заўважыў, што гэта дапаможа знізіць выдаткі, паколькі гэтыя будынкі вісяць на балансе.

**«Я якраз прыйшоў да адваротнай высновы. Я лічу, іх (кінематаграфістаў. — «Зв.») трэба пакінуць. Няхай вырабляюць, прадаюць і жывуць. Не — да пабачэння. Ну колькі разоў можна дапамагаць? Яны ж фактычна вісяць на плячах у дзяржавы, — абурыўся Прэзідэнт. — А навошта ім працаваць? Прынясуць дакумент, падмахнуць, Прэзідэнту на стол — дайце грошы. А за што даваць грошы? За апошнія некалькі гадоў гэта трэцця «новыя людзі». І мы ўсё дапамагаем...»**

Прэзідэнту далажылі аб структуры кінастудыі «Беларусьфільм», штатнай колькасці супрацоўнікаў, аснашчанасці студый і павільёнаў. У Мінску на тэрыторыі кінастудыі размяшчаецца вытворчы корпус са здымачнымі павільёнамі, аўтабаза, некалькі будынкаў, запланаваных пад знос, у Смалявічах — натурная пляцоўка. Штатная колькасць кінастудыі — 320 адзінак, але запоўненыя далёка не ўсе. Напрыклад, застаюцца вакантнымі дзве з трох пасад намесніка дырэктара кінастудыі. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ў такой колькасці намеснікаў няма неабходнасці. Галоўнае, каб былі спецыялісты, якія займаюцца кінавытворчасцю.

У структуру «Беларусьфільма» ўваходзяць тры асноўныя студыі: ігравых, дакументальных, анімацыйных фільмаў, — а таксама Тэатр-студыя кінаакцёра. Здымачныя павільёны, размешчаныя ў Мінску, занятыя пераважна пад будаўніцтва дэкарацый, здымкі кінафільмаў і стварэнне тэлевізійных праектаў. Цяпер на студыі працуюць над некалькімі кінастужкамі: на верасень запланавана прэм'ера карціны «Класная». Напрыканцы года выйдзе фільм «Пераломны момант». Пачата работа над карцінамі «Бацька Мінай. Партызанская легенда», «Адно на дваіх» і «Навагодні экспрэс».

Кіраўнік дзяржавы прайшоў па кінастудыі і завітаў у самыя цікавыя павільёны. Адзін з іх — павільён, дзе здымаюцца папулярныя тэлевізійныя шоу, напрыклад, «Добры вечар», «100 пытанняў даросламу», «Фактар.BY» і іншыя. Дарэчы, гэта самы вялікі павільён у краіне. «Не трэба спыняцца... Каб людзям «заходзіла». Пад гэта грошай не шкада, калі ёсць вынік», — параіў кіраўнік дзяржавы. Паказалі Прэзідэнту і экспазіцыю, прысвечаную беларускаму кіно, якую наведваюць экскурсійныя групы.

Аляксандр Лукашэнка даручыў увесь працэс падрыхтоўкі кадраў, кінавытворчасці, выдзялення на гэта сродкаў «жалезна браць на кантроль». «Цяпер мы, груба кажучы, «калючым дротам» абгародзім гэта. 320 чалавек — калі ласка, вырабляйце, прадалі — жывіце. З гэтага пачнём», — заявіў кіраўнік дзяржавы.

**А тых, хто дае вынік, прапануе перспектыўныя ідэі, па яго словах, трэба і адпаведна падтрымліваць. «Мы трацім шалёныя грошы марна. Дык трэба заплаціць людзям, якія працуюць», — адзначыў беларускі лідар.**

### РЭЖЫСЁРЫ Ў НАС ЁСЦЬ. ТРЭБА ІХ ЗБІРАЦЬ

Рэжысёр Кірыл Халецкі расказаў пра фільм «Класная», прэм'ера якога запланавана на верасень. «Божа мой, рэжысёры ёсць у нас! Ты ў нас як карысны выкапень. Ці ты, можа, аднекуль прыехаў?» — звярнуўся да яго Аляксандр Лукашэнка. Але Кірыл Халецкі — беларус, скончыў Акадэмію мастацтваў. Рэжысёр расказаў, што фільм «Класная» распавядае пра маладую настаўніцу, якая па размеркаванні прыехала ў аграгарадок і стала класным кіраўніком 11-га класа. «Фільм знаходзіцца на стадыі мантажу. Атрымліваецца вельмі добрае, светлае, жыццёвае кіно. Міністэрства адукацыі курыруе гэты праект, дапамагае нам. Кінастужка будзе ісці ва ўсіх кінатэатрах краіны з 18 верасня», — распавёў Кірыл Халецкі. Аляксандр Лукашэнка даў стваральнікам фільма невялікую параду: паказаць жыццё ў аграгарадку такім, якое яно ёсць на самай справе, у адрозненне ад мінскіх рэалій. «Каб тут кантрасту не было: што ў мазгах Мінск, а здымаеш ты аграгарадок», — адзначыў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы прызнаўся, што вельмі рады таму, што ў краіне ёсць маладыя рэжысёры: «Вось гэтыя зярняткі — з іх палавіна ўсё пачынацца. Яны потым збяруць каманду».

Аляксандру Лукашэнку паказалі ангар, дзе цяпер ствараюцца дэкарацыі для фільма «Пераломны момант» пра вясляроў. Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што больш танна і нават больш эфектна было б здымаць з натуры. Ён запэўніў, што патрэбная дапамога будзе аказана.

### СТАН СПРАЎ ВЕЛЬМІ НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫ

Больш дэталёва пытанні развіцця айчыннага кінематографа абмеркавалі на нарадзе з удзелам Прэзідэнта. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што рашэнне аб падобнай сустрэчы было прынята даўно.

**«Я прама хачу сказаць, што стан спраў на нашай славутай, знакамітай кінастудыі і ў галіне ў цэлым не тое што нездавальняючы, а вельмі нездавальняючы. Развалены. Дзяржавай створаны ўмовы для развіцця айчыннага кінематографа і ў прыватнасці «Беларусьфільма». Але аддача пакуль не тое што нулявая — ніжэйшая за нуль, мінусавая! Ні дзяржава, ні глядач вынікаў не бачаць.**

Для большасці беларусаў наша кіно скончылася, напэўна, на «У жніўні 44-га» або «Брэсцкай крэпасці». Глядзець проста няма чаго! Канчаткова страчаны сямейная, юнацкая, дзіцячая аўдыторыі, — крытычна

# БЕЛАРУСКАМУ КІНЕМАТОГРАФУ, АДПРАЦАВАНЫ»

## Прэзідэнт выказаў жорстка і катэгарычна

выказаўся кіраўнік дзяржавы. — І не трэба мне расказваць, як мы «рванулі» ў рабоце з гледачом і арганізавалі прагляды для працоўных калектываў».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што адсутнасць акупнасці на ўнутраным рынку яшчэ можна растлумачыць: мы па насельніцтве невялікая краіна, і вялікі прыбытак ад пракату атрымаць складана. Хоць, звярнуў увагу ён, калі зрабіць добры фільм, прыбытак атрымаць можна. «Але мы сваё прадаць за мяжу не можам, бо няма чаго. І канкурэнцыя сур'ёзная, і адміністрацыйныя рэсурсы ўключаюцца. Як мне казалі: «Не можам трапіць у Расію». А хто вас туды пусціць?! У іх свайго дабра такога хапае», — скептычна заўважыў кіраўнік дзяржавы.

Прэзідэнт нагадаў, што ў свой час была праведзена поўная мадэрнізацыя кінастудыі «Беларусьфільм», устаноўлена новае тэхналагічнае абсталяванне.

> **«Укладзены велізарныя сродкі! Аванс, які дзяржава выдзеліла беларускаму кінематографу, так і не адпрацаваны», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.**

Ён звярнуў увагу, што на прыкладзе падвільёнаў для здымак тэлевізійных праектаў на кінастудыі відаць, што беларусы могуць якасна вырабляць такі прадукт без прыцягнення замежных спецыялістаў. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што істотна паглыблены ў дэталі гэтага працэсу асабіста, таму неабыякавы і да кінематографа, і да нашых фільмаў.

### «КАРАНІ НЕ ЗАБЫВАЦЬ, АЛЕ ПРЫСТАСОЎВАЦЦА ДА СУЧАСНАСЦІ»

Прэзідэнт падзяліўся сваімі назіраннямі. Ён звярнуў увагу, што сёння гледачу прапаноўваюцца ў асноўным старыя савецкія фільмы. Напрыклад, распавёў Аляксандр Лукашэнка, раніцай убачыў па тэлевізары фільм «Знак бяды», зняты ў 1986 годзе. Па яго словах, гэта добрыя фільмы на тэму, якая балела іх стваральнікам і тагачаснай аўдыторыі. Але сучасны глядач захоча паглядзець больш дынамічнае кіно, магчыма, на іншую тэму.

> **«Вядома, карані свае не забываць, у нас добрае мінулае ў «Беларусьфільма», але трэба прыстасоўвацца да сучаснасці», — заўважыў ён.**

Усім адказным за кінематограф Прэзідэнт задаў канкрэтнае пытанне: што перашкаджае працаваць, што перашкаджае «забіць» гледача фільмамі? Адказы пра недахоп грошай не прымаюцца. Аляксандр Лукашэнка расказаў, што ў яго добрыя адносіны з расійскімі акцёрамі і рэжысёрамі і ён ведае, што на вытворчасць якаснага кіно не патрэбныя казачныя сродкі. Трэба ўмець лічыць грошы. «Там у асноўным гэта ўсё робяць прыватнікі. І прыватнікі грошы даюць, фінансуюць. І абы на што ніхто грошы свае не дасць. Гэта толькі дзяржава можа, — падкрэсліў ён. — На маёй памяці гэта ўжо восьмая ці дзявятая каманда. І пад гэту каманду мы выдзялялі грошы. І што?».

У сувязі з гэтым Прэзідэнт агучыў адзінае, па яго словах, правільнае рашэнне: «Не крыўдуйце, я вобразна скажу, вы вобразы любіце: калючы дрот вакол, 320 чалавек ёсць. Вырабляйце за гэтым дротам што хочаце — гэта ваша справа. Галоўнае, каб ідэалагічна правільна вы будоўвалі». Беларускі лідар папярэдзіў, каб кіношнікі ў пагоні за тэндэнцыямі ў кінематографе не перабіралі са сцэнамі гвалту, стральбы, крыві і падобнага. Па яго словах, не трэба да гэтага прывучаць грамадства — людзям можна даць добрую альтэрнатыву. А гэтай альтэрнатывы, звярнуў увагу кіраўнік дзяржавы, пакуль няма.

### ВУЧЫЦЦА ТРЭБА НА ПЛЯЦОЎЦЫ

Прэзідэнт зрабіў акцэнт, што развіццё кінематографа трэба пачынаць «ад кораня» — у прыватнасці ад Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Адміністрацыі Прэзідэнта пастаўлена жалезная задача: разабрацца з выкладчыкамі і з тым прадуктам, які яны адтуль выпускаюць. «У адваротным выпадку вы не здымеце ніводнага сучаснага душашчыпальнага фільма», — папярэдзіў кіраўнік дзяржавы.

Гаворачы аб пераемнасці пакаленняў, беларускі лідар успомніў знакаміты фільм «У жніўні 44-га», рэжысёр якога Міхаіл Пташук загінуў у аўтакатастрофе. «Вельмі шкада, што вось так здарылася. Але ж незаменных людзей няма. Хтосьці ж побач хадзіў, падказваў, нататнік насіў. Здымай, лепей здымай, — падкрэсліў ён. — Тое ж самае тычыцца і падрыхтоўкі нашай моладзі. Трэба глядзець, каго мы там рыхтуем». Прэзідэнт зрабіў акцэнт, што, як і ў іншых сферах, у кіно студэнт павінен быць на вытворчасці, вучыцца непасрэдна на пляцоўцы, глядзець на калег і разумець: тую прафесію выбраў ці не.

*(Заканчэнне на 4-й стар.)*

## У тэму

### «МАЛАДЫЯ ЎДЗЕЛЬНІКІ КІНАВЫТВОРЧАСЦІ ПАВІННЫ ЎБАЧЫЦЬ СЯБЕ ЗАПАТРАБАВАНЫМІ ВА ЎЛАСНАЙ КРАІНЕ»



**Намеснік прэм'ер-міністра Наталля ПЯТКЕВІЧ** расказала журналістам, што размова падчас нарады была жорсткая, але сумленная і справядлівая. «Колькі Прэзідэнт удзяляе ўвагі і кіно, і наогул мастацтву, яго развіццю ў нашай краіне, колькі сродкаў у гэта ўкладзена на працягу дзесяцігоддзяў... давайце будзем шчырымі — адпаведнай аддачы няма», — сказала яна. Віцэ-прэм'ер заўважыла, што ў апошні час «Беларусьфільм» не радуе гучнымі прэм'ерамі. Кажучы пра беларускае кіно, успамінаеш толькі кінастужкі мінулых гадоў. А ў той жа час дзяржава робіць вельмі шмат для падтрымкі кінематографа. Таму, па словах Наталлі Пяткевіч, такая размова наспела ўжо даўно. «Вельмі шкада, вядома, што давялося яе выносіць на ўзровень Прэзідэнта. У тым стане, у якім цяпер кіно знаходзіцца, па вялікім рахунку, яно нам не трэба, таму што мы яго не бачым. Яго няма, па сутнасці. Але ёсць вельмі вялікія надзеі на новае кіраўніцтва (прызначаны нядаўна новы кіраўнік кінастудыі «Беларусьфільм»), на новага міністра культуры, які ведае і разумее кіно... У іх ёсць жаданне нешта рабіць. Вельмі хочацца, каб мы ўсе, грамадзяне Беларусі, атрымалі наша, беларускае кіно», — падкрэсліла віцэ-прэм'ер. Наталля Пяткевіч адзначыла, што «Беларусьфільм» — гэта брэнд нашай краіны, брэнд з гісторыяй. І ён павінен зноў зазіхацець, тым больш што, звярнула ўвагу віцэ-прэм'ер, для гэтага зроблена ўсё. «Пачынаць трэба з самага пачатку — з моладзі. Кінамастацтва — гэта выдатны від мастацтва — і для задавальнення, і для разваг. Аднак гэта і спосаб самарэалізацыі вялікай колькасці моладзі, якая вырашыла прысвяціць сябе мастацтву. Маладыя студэнты, маладыя акцёры, рэжысёры, сцэнарысты, аператары, іншыя ўдзельнікі кінавытворчасці павінны ўбачыць сябе запатрабаванымі ва ўласнай краіне. Гэта самая галоўная задача», — падкрэсліла Наталля Пяткевіч.

### «КІНО — ГЭТА ПРАДУКТ»

**Міністр культуры Руслан ЧАРНЕЦКІ** падкрэсліў, што план па развіцці айчыннага кінематографа ёсць. І калі жыццё будзе прымушаць — у яго будуць уносіцца карэкціроўкі.



«Трэба падымаць якасць прадукту... Трэба асвойваць новыя рынкі, таму што кіно — гэта прадукт. Мы ў такім свеце жывём. Дзяржава выдзяляе на гэту сферу велізарныя грошы, а значыць, іх трэба апраўдваць і прадаваць фінальны прадукт. Для гэтага беларускае кіно павінна быць цікавым не толькі для саміх жыхароў Беларусі, але і для расіян, кітайцаў і прадстаўнікоў самых розных краін. А каб зрабіць кіно якасным, трэба вельмі ўважліва і прафесійна на кожным этапе здымачнага працэсу ўсё адсочваць, уключаючы дыстрыбуцыю і рэкламную кампанію», — сказаў міністр.

Кажучы пра стан спраў на «Беларусьфільме», Руслан Чарнецкі адзначыў, што не варта шукаць адказ на пытанне «хто вінаваты?», трэба адказваць на пытанне «што рабіць?». Міністр культуры звярнуў увагу, што гістарычна «Беларусьфільм», будучы часткай савецкай кінаіндустрыі, пераважна канцэнтраваўся на тэме Вялікай Айчыннай вайны. Гэты кірунак застанецца і цяпер, бо ён важны і блізкі для жыхароў Беларусі. Разам з тым плануецца пашыраць тэматычны ахоп, у тым ліку каб не ўзнікла крызісу жанру і каб кінастужкі былі максімальна шырока запатрабаваныя.

### «ПАДЫХОД ДА КІНАВЫТВОРЧАСЦІ БУДЗЕ МЯНЯЦЦА»



**Генеральны дырэктар «Беларусьфільма» Дзмітрый СЯМЁНАЎ** галоўнай задачай студыі назваў загрузку кінавытворчасці. І пачынаць, па яго словах, трэба з кадраў. «Безумоўна, на сёння ўжо пэўная работа праведзена. Створаны Назіральны савет пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Па гэтым шляху ў падборы новых кадраў і накіраванні іх на кінастудыю мы будзем рухацца. Нам бы хацелася, каб нашы новыя «кіношнікі» пастаянна знаходзіліся на базе кінастудыі і глядзелі, як нашы мэтры здымаюць кінафільмы, чэрпалі гэту атмасферу кінавытворчасці і ўжо потым давалі свой прадукт, які быў бы цікавы і запатрабаваны як на нашым рынку, так і за межамі краіны», — растлумачыў ён. Дзмітрый Сямёнаў расказаў, што цяпер праводзіцца работа па адборы новых сцэнарыяў, ідэй, якія пасля будуць прапрацоўвацца ў фокус-групах. «У прынцыпе, падыход да кінавытворчасці будзе мяняцца. Мы будзем абапірацца на тое кіно, якое сёння запатрабавана. Безумоўна, мы працуем у цесным узаемадзеянні з кінатэатрамі нашай краіны. У нас ёсць зваротная сувязь і пэўны заказ ад іх. Таксама мы плануем запусціць на базе кінастудыі выпуск серыяльнай вытворчасці», — заявіў генеральны дырэктар.

### «ПРАГНЫЯ ДА ПРАЦЫ СПЕЦЫЯЛІСТЫ ЁСЦЬ, АЛЕ МАЛА СЦЭНАРЫЯЎ»



**Рэжысёр Кірыл ХАЛЕЦКІ** на нарадзе дакладваў аб станаўленні маладых рэжысёраў ва ўмовах Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Па яго словах, гэта набалелае пытанне. Кірыл Халецкі сам нядаўна скончыў Акадэмію мастацтваў і на сваім прыкладзе расказаў, што ВНУ дае найперш тэарэтычныя веды. «Лагічным працягам дзейнасці выпускнікоў бачыцца знаходжанне на кінастудыі, якая выпрабляе кіно, у якасці творчай адзінкі. Але, на жаль, на дадзены момант вельмі мала праектаў, дзе яны могуць сябе праявіць. Праз два гады адпрацоўкі малады спецыяліст сябе так і не праяўляе», — расказаў рэжысёр. Кірыл Халецкі падкрэсліў, што маладыя і прагныя да працы спецыялісты ёсць, яны вельмі хочуць здымаць кіно.

«Наша кіно — яно вельмі маладое, жыццярадаснае, шчырае, сумленнае, добрае. Над ім працуе маладая каманда. Мы натхняемся сусветнымі стандартамі, мы не адстаём ад сучаснага кіно, мы расцём, гэта літаральна новае дыханне беларускага кіно», — сказаў Кірыл Халецкі. Па яго словах, цяпер ёсць праблема са сцэнарыстамі, і, як вынік, цяпер так мала добрых сцэнарыяў. Таму ёсць прапанова стварыць партфель сцэнарыяў, якія будуць разглядацца і планавацца да выхаду фільмаў на некалькі гадоў наперад. Рэжысёр падкрэсліў, што сустрэча з кіраўніком дзяржавы для яго лёсавызначальная, таму што ўплыў і падтрымка з боку Прэзідэнта мае вельмі вялікае значэнне.

# «АВАНС... ТАК І НЕ АДПРАЦАВАНЫ»

*(Пачатак на 2–3-й стар.)*

**«Тэорыя павінна быць, але трэба, каб людзі бачылі гэтую здымачную пляцоўку. Калі яны трапілі туды, куды трэба, то зробяць адпаведныя высновы. Гэта няпростая праца, цяжкая праца», — падкрэсліў беларускі лідар.**

## «ДЫКТАТУРА БУДЗЕ ВАМ НА КАРЫСЦЬ»

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу, што сёння вельмі няпростая палітычная і геапалітычная абстаноўка. Побач з нашай краінай вельмі неспакойна, з'яўляецца ўсё больш гарачых пунктаў.

«Бог нас захаваў і дапамагае нам захаваць гэты кавалак зямлі. Паглядзіце, вакол вайна, вакол бушуе», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Да прыкладу ён прывёў Фінляндыю. Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што шмат гадоў Фінляндыя жыла побач з Расіяй, але ім «спатрэбілася» ўступіць у НАТА. «Ужо кажуць аб тым, каб блакіраваць Балтыйскае мора, каб не пусціць гандлёвыя караблі, у тым ліку і нашы. Мы ж цяпер гандлюем не праз Літву і Латвію. Вар'яты гэтыя нас не пускаюць, мы гандлюем праз Ленінград па Балтыцы. «Вось мы закрыем недзе там у Даніі праход». Што ж, мы дазволім, каб з нас здзекаваліся? Ваенныя караблі будуць суправаджаць гандлёвыя судны, — прывёў прыклад беларускі лідар. — Балтыка, балтыйскія тры дзяржавы, Польшча — ну гэтым тром, ім чаго не хапала? Я бачыў, як гэта было: ім, як у народзе кажуць, «пёрлі ўсё», каб паказаць, што ўскраіны ў Савецкім Саюзе развіваюцца і гэтак далей. Высокатэхналагічныя былі рэспублікі, порты, гандлявалі вялізным аб'ёмам рэсурсаў. Чаго не хапала? Ладна, вы хочаце самастойна. Мы таксама хочам самастойна. Чаго вы плюеце ў наш бок?» Кіраўнік дзяржавы прывёў да прыкладу і Украіну, дзе ідзе вайна, і Каўказ, дзе яна не скончылася.

І ў гэтай сітуацыі каштуе велізарных намаганняў захоўваць мір і спакой у краіне. «Вызваліце мяне ад таго, каб здымаць фільмы. Але я памятаю, як казаў вялікі Ленін: з мастацтваў для нас найважнейшым з'яўляецца не скульптура, не жывапіс, не опера, не спевы, а кіно. І ён меў рацыю», — адзначыў беларускі лідар.

Прэзідэнт папярэдзіў, што лішніх грошай не будзе і ніхто грошай пад нейкую новую каманду не дасць.

**«І калі вы да 1 верасня на чале з міністрам культуры не наведзяце тут парадак... рашэнні будуць вельмі жорсткімі, — папярэдзіў ён. — Спытаем вельмі жорстка». Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што сёння ёсць шмат таленавітых, здольных людзей, якія хочуць і могуць працаваць. Трэба бачыць і задзейнічаць такіх людзей. І ўвесь час бегчы наперад.**

Кіраўнік дзяржавы таксама даў кіношнікам невялікую параду. «Што вы там дэкарацыі выбудоўваеце, ангар. У нас жа ёсць натура. Рабіце больш з натуры. І мы вам, як у савецкія часы, дапаможам бясплатна — органы ўлады, армія і іншыя... Можа быць, і паменш трэба будзе павільёнаў і будаўніцтва. Там, дзе не трэба, там не трэба гэта будаваць.

**Мы вам дапаможам. Усё вы крычыце: дыктатура. Вось гэта дыктатура будзе вам на карысць».**



Фота БелТА.



## НІЯКАЙ ІДЭАЛОГІІ БЕЗ КІНО БЫЦЬ НЕ МОЖА

Прэзідэнт адзначыў, што ёсць пытанні і да Міністэрства культуры. Ён нагадаў міністру культуры Руслану Чарнецкаму, што ў яго няма ніякага шанцу працаваць як раней. «Мінкульт павінен больш актыўна варушыцца. Я разумею: без урада, Адміністрацыі Прэзідэнта будзе складана. Вось тут трэба дапамагчы. Але павінны і спытаць жалезна», — заявіў Аляксандр Лукашэнка. Ён спытаў прама: «Чаго не хапае і што трэба?» Але без самаправаздач.

«Я гатовы вам дапамагаць, і дапамагаць не толькі як Прэзідэнт, у якога ў руках гэтыя фінансы. Калі трэба асабіста падключыцца — з задавальненнем», — сказаў ён. Аляксандр Лукашэнка таксама паабяцаў, што ахвотна прыйдзе на прагляд фільмаў, калі будзе што глядзець.

Беларускі лідар адзначыў, што з павагай ставіцца да творчых людзей. «Вы павінны быць памяркоўнымі, узважанымі — беларусамі, зямнымі людзьмі, якія глядзяць наперад, — заўважыў кіраўнік дзяржавы. — Давайце сур'ёзна: плаціць будзем за працу. З заўтрашняга дня. Без працы ніякіх авансаў не чакайце. Калі толькі на вытворчасць. Здымаеце фільм, са спецыялістамі і фінансістамі дамовіліся, што гэта нармальна (чалавек, які будзе несці за ваш фільм адказнасць), мы вам — невялікі аванс, ідзіце і працуйце. Зрабілі добры прадукт — грошай не шкада, тым больш на добрае кіно, таму што гэта страшны дэфіцыт у нашым грамадстве. Без гэтага нікуды. Ніякай ідэалогіі без кіно быць не можа».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што ў беларускага кіно не будзе праблем ні з паказамі на тэлеканалах, ні з рэкламай, ні з сістэмай пракату. Галоўнае — даць якасны прадукт. Прэзідэнт звярнуў увагу, што шмат праблем не толькі на кінастудыі, але і ў іншых культурных установах: музеях, тэатрах. І паставіў задачу адказным асобам кантраляваць, хто працуе ў такіх установах.

**А да творчых асоб звярнуўся прама: «Я вам шчыра кажу тое, што мог бы не сказаць сялянам або рабочаму каля станка. Без вас мы можам абысціся. Таму я адкрыта кажу: так — так, не — не. Усё роўна вас няма, мы нічога не губляем, дзяржава. Калі б было што губляць, то вядома. А што губляем мы? У мяне выйсця іншага няма: або — або.**

Таму я кажу міністру, кіраўніку «Беларусьфільма»: не будзе выніку — вельмі жорсткае стаўленне. Я ў вас спытаў: вы гатовыя, ведаеце сітуацыю? Гатовыя. Ідзіце — давайце вынік. Не дасце — лічыце, што вы мяне падманулі. Не дасце — ну, адпаведнае стаўленне. Таму не крыўдуйце. Я не кажу, што так будзе, але, калі раптам крайні варыянт, — ну што, мы нічога не губляем». Прэзідэнт адзначыў, што, як і многія, сам ён не хоча такога развіцця падзей і заклікаў не даводзіць сітуацыю да абсурду.

Гаворачы ў цэлым аб прадстаўніках сферы культуры, кіраўнік дзяржавы нагадаў, як павялі сябе некаторыя з іх у 2020 годзе. «Што ўтойваць, ён (той год. — **«Зв.»**) паказаў, хто ёсць хто. І вы былі напярэдзе. І што, калі б не вытрымалі ў 2020 годзе? Мы б ваявалі... Ды не ваявалі, нас бы не было даўно! Вы бачыце, што ва Украіне робіцца. Нас бы тут не было», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Эмоцыі, якія тады авалодалі некаторымі творчымі людзьмі, варта было б стрымаць у сабе, а не паддавацца ім, упэўнены Прэзідэнт. «Я не хачу вас усіх агулам вінаваціць. Вы людзі эмацыянальныя, я таксама, але эмоцыі часам трэба выкарыстоўваць на карысць справы. І хаваць іх далей да пары да часу. Не спяшайцеся. Куды вы спяшаецеся? Фільмы рабіць вы не спяшаецеся, а вось выскачыць на вуліцу ў кароткіх спаднічках — гэта вы маглі, і ўсіх «гвалцілі» там», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

## ПАТРЭБНА НЕ ФІНАНСАВАЯ, А АДМІНІСТРАЦЫЙНАЯ ДАПАМОГА

Па словах міністра культуры Руслана Чарнецкага, для таго, каб у краіне зноў здымалася якаснае кіно, трэба выканаць дзве задачы. Адна з іх — кардынальна павысіць узровень мастацкіх фільмаў і вывесці іх на міжнародны пракат для забеспячэння акупнасці.

«Так, нам дапамога тут спатрэбіцца. Але дапамога не фінансавая, таму што дзяржава выдзяляе грошы ў дастатковым аб'ёме. А дапамога адміністрацыйная», — адзначыў ён.

Міністр культуры падкрэсліў, што цяпер новы кіраўнік «Беларусьфільма» збірае новую каманду, бо за той час, што кіно не здымалася, спецыялісты раз'ехаліся туды, дзе яно здымаецца, — такая спецыфіка прафесіі. Прыняты таксама крокі па зніжэнні залежнасці эканомікі прадпрыемства ад бюджэтнага фінансавання, вызначаюцца шляхі зніжэння агульнастудыйных выдаткаў, укараняецца гнуткая ў адносінах да заказчыка сістэма цэнаўтварэння.

«Мы разумеем, што рост даходаў залежыць не толькі ад скарачэння выдаткаў, але і ад вываду на рынак кінапрадукцыі высокай якасці», — сказаў Руслан Чарнецкі.

Ён таксама адзначыў, што на сёння ажыццяўляецца перабудова тэматычнага планавання фільмавытворчасці. У год плануецца стварыць адзін буйны праект — гістарычны, ваенны або на патрыятычную тэму. І яшчэ 4-5 малабюджэтных праектаў папулярных жанраў з кароткім, да года, тэрмінам вытворчасці. Міністр запэўніў, што будзе адроджана вытворчасць малабюджэтных серыялаў па заказах беларускіх тэлеканалаў і арганізавана супрацоўніцтва з IT-кампаніямі па стварэнні фільмаў з выкарыстаннем тэхналогіі штучнага інтэлекту. Плануецца пашыраць сумесную вытворчасць з замежнымі кампаніямі. Па расійскім вопыце, да ацэнкі сцэнарыяў і змантыраваных версій будуць прыцягвацца фокус-групы з ліку прадстаўнікоў мэтавай аўдыторыі. Уводзяцца новыя механізмы рэкламнай кампаніі, з гэтага часу яна будзе пачынацца за 3-4 месяцы да прэм'еры, чаго раней не рабілася.

**Валерыя СЦЯЦКО.**

ПАРЛАМЕНЦКІ ДЗЁННІК

# ЗАКАНАДАЎЧЫЯ ІНІЦЫЯТЫВЫ І МІЖНАРОДНАЕ СУПРАЦОЎНІЦТВА

## На пасяджэнні Савета Палаты прадстаўнікоў абмеркавалі вынікі работы і планы на перспектыву

Сярод пытанняў, што абмяркоўваліся, — ход падрыхтоўкі законапраектаў да разгляду на бягучай сесіі Палаты прадстаўнікоў, якая завершыцца 30 чэрвеня, праекта плана падрыхтоўкі праектаў заканадаўчых актаў на 2026 год.

Як адзначыў **Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЯЕНКА**, за бягучую сесію дэпутаты рэалізавалі практычна ўсе заканатворчыя планы. «За сесіённы перыяд прынята 58 законапраектаў, — праінфармаваў Ігар Сергяенка. — Ёсць праекты, па якіх яшчэ вядзецца работа». Спікер паставіў перад дэпутацкім корпусам задачу — да заканчэння бягучай сесіі завяршыць работу па законапраектах, уключаных у графік.

Дэпутаты выступілі з заканадаўчай ініцыятывай, якая звязана з распрацоўкай праекта закона «Аб валанцёрскай дзейнасці».

Валанцёры бяруць удзел у самай рознай сацыяльна арыентаванай дзейнасці. Аднак дагэтуль адсутнічае механізм рэгулявання валанцёрскай дзейнасці, а самае галоўнае, валанцёры не маюць юрыдычна замацаваных правоў і гарантый, што стварае рызыкі ў частцы абароны іх жыцця і здароўя. Асабліва гэта датычыцца валанцёраў, задзейнічаных у рэагаванні на надзвычайныя і крызісныя сітуацыі.

«Мы памятаем прыклады масавай валанцёрскай работы на граніцы паміж Рэспублікай Беларусь і Рэспублікай Польшча (міграцыйны крызіс), калі праца валанцёра была спалучана з пэўнай рызыкай, — канстатаваў **старшыня Пастаяннай камісіі па ахове здароўя, фізічнай культуры, сямейнай і маладзёжнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Валерый МАЛАШКА**. — І ў гэтай частцы мы як сацыяльна адказная дзяржава павінны гарантаваць бяспечную працу людзей, якія бясплатна прыйшлі на дапамогу людзям. У сучасным свеце гуманізм — важны складнік. Гэты заканадаўчы акт будзе ўнікальны: ён падкрэсліць найлепшыя рысы беларускага народа, традыцыі, якія мы нясём праз пакаленні, або выклікі часу, што праходзім на розных этапах свайго станаўлення».

Як звярнуў увагу старшыня Пастаяннай камісіі, пытанні заканадаўчага рэгулявання валанцёрскай дзейнасці раней прапрацоўваліся з зацікаўленымі дзяржаўнымі органамі, але іх меркаванне наконт падрыхтоўкі адзінага законапраекта раздзялілася. Асаблівую зацікаўленасць у распрацоўцы законапраекта праявілі Беларускае таварыства Чырвонага Крыжа, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, Беларуская праваслаўная царква.

«У ходзе пасяджэння круглага стала, які адбыўся па ініцыятыве пастаяннай камісіі, з удзелам прадстаўнікоў вышэйназваных дзяржаўных органаў і грамадскіх аб'яднанняў, было выказана аднагалоснае меркаванне аб тым, што неабходнасць карэкціроўкі заканадаўства аб валанцёрстве ў нашай краіне носіць аб'ектыўны характар, — адзначыў Валерый Малашка. — Прыняцце адзінага нарматыўнага прававога акта аб валанцёрстве дазволіць сфарміраваць арганізацыйна-прававы механізм ажыццяўлення валанцёрскай дзейнасці, будзе садзейнічаць стварэнню ўмоў для яе шырокага распаўсюджвання і развіцця, стымуляванню і павышэнню эфектыўнасці работы валанцёрскіх арганізацый, павышэнню іх ролі ў вырашэнні сацыяльна значных задач».

Падчас пасяджэння Савета Палаты прадстаўнікоў абмяркоўваліся і пытанні міжнароднага характару. **Старшыня Пастаяннай камісіі па міжнародных справах Палаты прадстаўнікоў Сяргей РАЧКОЎ** праінфармаваў аб выніках свайго ўдзелу ў XI Парламенцкім форуме БРІКС, які на мінулым тыдні прайшоў у Бразіліі. У размове з журналістамі дэпутат звярнуў увагу на тое, што Беларусь упершыню ўдзельнічала ў гэтым мерапрыемстве ў якасці краіны-партнёра і была добра ўспрынята гэтым аб'яднаннем.

«Мы азнаёмілі нашых калег з ініцыятывай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па стварэнні Хартыі разнастайнасці і шматпалярнасці ў XXI стагоддзі. Аўдыторыя станоўча ўспрыняла гэту ініцыятыву», — сказаў дэпутат.

**Вераніка КАНЮТА.**

ЭКАНАМІКС

# ДОБРЫ ЗАПАС ТРЫВАЛАСЦІ



## Што паўплывала на рост золатавалютных рэзерваў, расказалі ў Нацбанку

Золатавалютныя рэзервы Беларусі дасягнулі свайго гістарычнага максімуму і перавысілі 11 мільярдаў долараў па выніках мая 2025-га. Што з'яўляецца складнікам гэтай лічбы і якая роля рэгулятара ў яе росце, расказаў першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка Аляксандр ЯГОРАЎ.

— Калі казаць увогуле аб узроўні золатавалютных рэзерваў, то гэта 11,2 мільярда долараў ЗША. Але, што больш важна, гэта не абсалютнае значэнне гэтай лічбы, а суадносіны з нашым знешнім гандлем (і гэта ўжо 2,6 месяца імпарту).

Па словах першага намесніка старшыні праўлення Нацбанка, у росце ЗВР некалькі складнікаў:

— Першы — гэта паслядоўная палітыка Нацыянальнага банка па ўкладанні часткі сродкаў золатавалютных рэзерваў у золата. Рост кошту золата за тройскую унцыю (прыкладна на 667 долараў з пачатку года) дазволіў нарасціць рэзервы прыблізна на 1,1 мільярда долараў ЗША. Але ў цэлым рост склаў больш за два (мільярды долараў. — **«Зв.»**).

Другім важным фактарам, па словах Аляксандра Ягорава, стала купля валюты на ўнутраным рынку:

— Тут можна вылучыць некалькі фактараў. Перш за ўсё гэта паслядоўная працэнтная палітыка, якая паказвае ашчадную перавper важнасць беларускага рубля над замежнымі валютамі. Яна дазволіла забяспечыць чысты продаж валюты насельніцтвам (крыху больш за 400 мільёнаў долараў ЗША з пачатку года).

Другі важны фактар — чысты продаж валюты нерэзідэнтамі (прыкладна паўмільярда долараў).

Аляксандр Ягораў адзначыў, што ўжо ў красавіку-маі гаспадарчыя суб'екты таксама перайшлі ў станоўчую плоскасць, забяспечыўшы чысты прыток валюты ў краіну.

— Таму ў цэлым камбінацыя некалькіх фактараў (адбілася на росце ЗВР. — **Заўв. аўт.**): першы — інвестыцыйная палітыка (гледзячы ў якія інструменты ўкладваць залатыя валютныя рэзервы), другі — працэнтная палітыка ў дачыненні да фізічных асоб і трэці — працэнтная палітыка ў цэлым, у тым ліку разумнае абмежаванне грашовай масы, якое дазваляе забяспечваць збалансаванасць валютных патокаў юрыдычных асоб.

Гаворачы аб магчымых рызыках, першы намеснік старшыні праўлення Нацбанка адзначыў ваганні цаны на золата:

— Калі кошт золата вырас, то ён можа і знізіцца. Але для сябе мы бачым, што нават калі адбудзецца зніжэнне цаны на золата, то істотнага зніжэння золатавалютных рэзерваў (да тых узроўняў, якія ў тым ліку вызначаны ўказам Прэзідэнта) не адбудзецца, і мы будзем мець дастаткова добры запас трываласці і з пункту гледжання рэзерваў, і з пункту гледжання правядзення ўзважанай грашова-крэдытнай палітыкі.

Ацэньваючы сітуацыю на інвестыцыйным рынку, Аляксандр Ягораў адзначыў, што асноўная тэндэнцыя, якая будзе пашырацца, — большая розніца ў стаўках па доўгіх і кароткіх дэпазітах.

— З улікам даступнасці інструментаў Нацыянальнага банка мы лічым, што ў найбліжэйшы час стаўкі па кароткіх дэпазітах пачнуць паступова зніжацца і вяртацца ва ўзровень калідора працэнтных ставак Нацыянальнага банка. Што датычыцца доўгіх дэпазітаў, мы лічым, што бягучы ўзровень прымальны, ён забяспечвае попыт на дэпазіты ў нацыянальнай валюце з боку насельніцтва, і перш за ўсё ў доўгатэрміновыя, — растлумачыў спікер.

Паводле яго слоў, прыкладна 84 % усіх дэпазітаў — безадзыўныя дэпазіты на тэрмін больш за адзін год:

— Гэта ўстойлівая рэсурсная база для банкаў для таго, каб ажыццяўляць перш за ўсё інвестыцыйнае крэдытаванне, якое нацэлена на доўгатэрміновы эканамічны рост.

**Вольга АЛЯКСАНДРАВА.**


Центр Промышленной Оценки

• Организация аукционов
• Оценка всех видов имущества

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ЭЛЕКТРОННЫХ ТОРГОВ

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона** | ЗАО «Центр промышленной оценки», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 2. УНП 191021390 |
| **Продавец** | ОАО «Белшина», г. Бобруйск, ш. Минское, 4. УНП 700016217 |
| **Оператор ЭТП** | ООО «ИПМ-Консалт оценка», г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1. УНП 191224638 (www.ipmtorgi.by) |

**Предмет электронных торгов**

**Лот № 1**
Адрес: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ул. Максима Горького, д. 38а**

**Встроенное офисное помещение 491,1 кв. м.**
(административно-торговое помещение, инв. номер 710/D-54707)

***Обременение*:** площади помещения сданы в аренду. Более подробную информацию по арендаторам можно узнать у организатора аукциона

**Начальная цена лота № 1 с НДС 20 % – 970 800,00 бел. руб.** (снижена на 19 %)

**Лоты № 4 – 23 (**Месторасположение: **Могилевская обл., г. Бобруйск, ш. Минское, 8/85)**

| № лота | Наименование | Начальная цена лота, бел. руб. |
|---|---|---|
| **2** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000051) | **8 329,16** |
| **3** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000052) | **8 292,47** |
| **4** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000053) | **7 965,96** |
| **5** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000054) | **7 965,96** |
| **6** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000055) | **8 196,37** |
| **7** | **Пресс** 800*800 (инв. № 02639000055) | **8 196,37** |

**Демонтаж, разборка, погрузка и транспортировка предмета аукциона проводится за счет покупателя**

Задаток **10 % от начальной цены предмета аукциона** перечисляется на р/с BY47BELB30120028500030226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», БИК BELBBY2X, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки»

**Срок подписания договора купли-продажи** — **10 (десять)** рабочих дней после проведения аукциона

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Если между продавцом и покупателем в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после заключения договора купли-продажи. По письменному заявлению покупателя по лоту № 1 может быть предоставлена рассрочка оплаты стоимости имущества на срок до 3-х лет с ежемесячной индексацией платежей согласно договору купли-продажи, при первоначальном платеже не менее 20 % от цены продажи с учетом ранее внесенной суммы задатка

**Порядок проведения электронных торгов, критерии выявления победителя торгов, порядок оформления участия в торгах и результатов торгов установлен регламентом электронной торговой площадки «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)**

Победитель электронных торгов, либо единственный участник торгов, согласившийся повысить начальную цену на 5 %, обязан возместить организатору торгов затраты на их проведение и оплатить вознаграждение по лоту № 1 – **0,5 %,** по лотам №№ 2–7 – **8 % от итоговой цены лота** в течение 3 (трех) рабочих дней после проведения торгов

Предыдущие извещения о проведении аукциона по лоту № 1 опубликованы в газете «Звязда»: 19.02.2025

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за один день до наступления даты проведения аукциона

**Дата и время начала и окончания электронных торгов: 15.07.2025 с 11.00 до 12.00.**
Торги продлеваются на 10 минут с момента подачи ставки, в случае если ставка поступила менее чем за 10 минут до окончания торгов.
**Заявки на участие в электронных торгах принимаются по 14.07.2025 до 17.00 на ЭТП «ИПМ-Торги» (ipmtorgi.by)**

**Контактные телефоны: +375 17-310-36-37; +375 (29) 154-34-35. E-mail: auction@cpo.by**



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

| | |
|---|---|
| **Организатор аукциона, оператор ЭТП** | ООО «Расантехторг», г. Минск, ул. Беды, 33, помещение 339. Адрес ЭТП: **www.torgi24.by** |
| **Продавец** | ООО «ААА Солюшенс», УНП: 19297125, г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, комн. 38 |

**Предмет электронных торгов:**

| Лот | Наименование (назначение), инвентарный номер | Начальная цена без НДС (бел. руб.) |
|---|---|---|
| **1042** | Дебиторская задолженность ООО «ААА Солюшенс» (с полным списком дебиторов, можно ознакомиться на торговой площадке: www.torgi24.by) | **11 173 729,62** |

**расположенный по адресу:** г. Минск, ул. Бабушкина, 4а, комн. 38

**Размер шага** составляет **5 %** от начальной цены лота

**Задаток 5 %** от начальной цены предмета электронных торгов в белорусских рублях перечисляется на р/с BY56UNBS30120893600010000933 в ЗАО «БСБ Банк», код UNBSBY2X, г. Минск, пр-т Победителей, 23/3, УНП 191514793, получатель: ООО «Расантехторг»

**Срок подписания договора купли-продажи: 5** (пять) рабочих дней после электронных торгов.

**Условия оплаты предмета электронных торгов**

Победитель торгов (претендент на покупку) обязан оплатить предмет аукциона в соответствии с договором купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения торгов, если иной срок не установлен собранием (комитетом) кредиторов (участников)

Победитель аукциона (претендент на покупку) обязан возместить затраты на проведение торгов и оплатить вознаграждение организатору аукциона в размере **1 %** от цены продажи лота в течение 5 (пяти) дней со дня проведения аукциона. Затраты на организацию и проведение электронных торгов составили: по лоту – **не более 10 000,00 бел. руб.**

**Дата и время начала торгов**: **26.06.2025** в 11.00.
**Дата и время окончания торгов: 26.06.2025** в 16.00

Для участия в торгах, необходимо подать заявку и пройти регистрация в качестве участника торгов на торговой площадке: **www.torgi24.by**. Прием документов на участие в торгах осуществляется организатором торгов ООО «Расантехторг» на электронную почту: **info@torgi24.by**. Срок приема заявлений на участие в торгах и оплаты задатка – с **11.06.2025 по 24.06.2025** с 9.00 до 17.00

**Контактные данные: +375 (29) 607-79-50; +375 (29) 607-22-87. E-mail: info@torgi24.by**

# АБАНЕНТ МАЛАДАСТУПНЫ... АЛЕ ГЭТА ЧАСОВА

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Пакуль у некаторых населеных пунктах краіны праблема застаецца актуальнай. Пра гэта сведчаць звароты людзей, якія паступаюць падчас прыёму грамадзян, напрыклад, кіраўніцтвам Палаты прадстаўнікоў. Рэдакцыя звязалася з заяўнікамі, каб даведацца падрабязнасці.

## «КАБ ПАГАВАРЫЦЬ ПА МАБІЛЬНЫМ ТЭЛЕФОНЕ, ТРЭБА ВЫХОДЗІЦЬ НА ВУЛІЦУ»

— Звычайна для таго, каб пагаварыць па мабільнай сувязі, у доме трэба шукаць спецыяльныя «зоны» або выходзіць на вуліцу, — расказвае Іван Ванага, жыхар вёскі Шаўры Браслаўскага раёна. — Аднак нас не задавальняе не толькі дрэнная якасць мабільнай сувязі, але і інтэрнэту. І гэта пры тым, што мы жывём усяго ў пяці кіламетрах ад Браслава...

Са сваёй праблемай вяскоўцы звярталіся да спецыялістаў аднаго з аператараў мабільнай сувязі. Яны абследавалі мясцовасць, прыблізна год таму ўстанавілі новую антэну, але станоўчых вынікаў гэта не прынесла.

— Праз некаторы час з боку службы мабільнага аператара кожнаму з вяскоўцаў было прапанавана на даху дома ўстанавіць невялікую антэну. Аднак яе кошт складае 700 рублёў, гэта вельмі значная сума, і не кожны пенсіянер зможа заплаціць яе, — гаворыць Іван Феліксавіч.

Праблема дрэннай якасці мабільнай і інтэрнэт-сувязі хвалюе таксама жыхароў вёскі Кавалі Расонскага раёна, расказала нам Галіна Бутар.

— Для таго каб пагаварыць па мабільным тэлефоне, вяскоўцы вымушаны выходзіць на вуліцу, а нярэдка — узыходзіць на ўзгорак. Інакш звязацца са сваімі роднымі і блізкімі наогул немагчыма. Уявіце сабе, якія цяжкасці прыходзіцца пераадольваць тады, калі тэрмінова патрэбна выклікаць урача або звярнуцца да спецыялістаў іншых службаў! — абураецца Галіна Пятроўна. — У нашай вёсцы няма аддзялення паштовай сувязі, абслугоўванне мясцовых жыхароў вядзецца пры дапамозе паштовага аўтамабіля. А паколькі мабільная і інтэрнэт-сувязь працуюць дрэнна, спецыялісты паштовай сувязі часта не могуць у сваіх кліентаў прыняць аплату камунальных паслуг, выплаціць пенсію, аформіць падпіску на газеты, часопісы, прыняць іншыя плацяжы.



— Нават паглядзець тэлевізар немагчыма без цяжкасцяў, — наракае Галіна Пятроўна. — Па прычыне дрэннай інтэрнэт-сувязі часта «зависае» «Zala». Пагадзіцеся, што ў наш час, калі імкліва развіваюцца інфармацыйныя тэхналогіі, гэта праблема павінна вырашацца.

## БУДЗЕ І 5G. ПА ЎСЁЙ КРАІНЕ

— Праблема дрэннай якасці мабільнай сувязі сапраўды існуе ў асобных рэгіёнах нашай краіны, — адзначае **Уладзімір БАРАВЕНКА, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па прамысловасці, энергетыцы, транспарце, сувязі і лічбавым развіцці Палаты прадстаўнікоў**, да якога мы звярнуліся па каментарый. — У час парламенцкіх слуханняў мы разглядзелі пытанні, якія датычацца лічбавага права. Сумесна з прадстаўнікамі Міністэрства сувязі і інфарматызацыі было вывучана і пытанне мабільнай сувязі. Праблема знаходзіцца ў нас на пастаянным кантролі. Складзены спіс пытанняў, узнятых па выніках прыёму грамадзян.

Значны імпульс у рабоце па паскораным развіцці сетак сотавай сувязі дало прыняцце Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 26 жніўня 2024 года № 335 «Аб аказанні паслуг сотавай рухомай электрасувязі». У развіццё гэтага дакумента прынята таксама пастанова Савета Міністраў, вызначаны адпаведныя параметры мабільнай сувязі, якія будуць устаноўлены ў Рэспубліцы Беларусь. «Гэта значыць, што да канца 2030 года ахоп якаснай мабільнай сувяззю пакалення 4G у Беларусі дасягне 99 %», — адзначыў Уладзімір Баравенка.

Акрамя таго, прадугледжана ўвядзенне сацыяльнага тарыфу за карыстанне паслугамі электрасувязі. Ён уведзены сёлета з 1 красавіка. Так, тарыфам прадугледжаны памер аплаты ўсяго дзевяць рублёў 40 капеек за 200 хвілін званкоў ва ўсе сеткі, 50 смс-паведамленняў і 2 Гб інфармацыі. Такім чынам, пенсіянеры маюць магчымасць устанавіць гэты тарыф і атрымліваць якасную сувязь.

Уладзімір Баравенка згадаў яшчэ адзін Указ Прэзідэнта ад 1 красавіка бягучага года № 139, які даў пачатак развіццю сеткі 5G у Рэспубліцы Беларусь. 5G — гэта новы прагрэсіўны фармат сувязі, хуткасць якога ў 10 разоў большая, чым 4G, што дзейнічае сёння. Такім чынам, інтэрнэт-сувязь ва ўсіх кутках краіны значна палепшыцца. «Сёння нават складана

ВАРТА ВЕДАЦЬ

# НА «КУПАЛЛЕ» ПРЫЕХАЦЬ ПРОСТА

